**УДК 397**

# АСАБЛІВАСЦІ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ПАЛЯКАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

***І. У. ГЛІНСКІ***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК)***

*Артыкул дае характарыстыку традыцыйнай культуры палякаў на тэрыторыі Беларусі. Разглядаецца гісторыя з'яўлення палякаў на Беларусі, іх каляндарная, памінальная абраднасць, лад жыцця, заняткі і другія асаблівасці, якія адрозніваюць палякаў ад іншых этнічных груп.*

Этнакультурныя сувязі беларускага і польскага народаў маюць даўнія традыцыі. Яшчэ ў XII-XIII стагоддзя пад ціскам крыжакоў пачалося перасяленне часткі польскага насельніцтва на тэрыторыю Беларускага Панямоння. Узмацненне польскага этнакультурнага ўплыву на Беларусі трапляе на перыяд Люблінскай уніі 1569 года, калі беларускія землі разам з іншымі землямі ВКЛ увайшлі ў федэратыўную дзяржаву Рэч Паспалітую. З XVII стагоддзя паланізацыя беларускіх магнатаў і шляхты набыла вялікія маштабы, многія з іх, з'яўляючыся этнічна беларусамі, пазней прыпісвалі сабе польскае паходжанне. Амаль да пачатку XX стагоддзя паланізаваную беларускую шляхту афіцыйныя ўлады прыпісвалі да палякаў.

Паланізацыя беларускага дваранства аказвала моцны ўплыў не толькі як паланізацыя беззямельнай шляхты, але і як паланізацыя сялян. Менавіта таму палякі ў Магілеўскай губерніі ёсць не толькі сярод дваран, але таксама сярод мяшчан і сялян.

Былая шляхта, якая лічыла сябе носьбітамі польскай культуры, неахвотна злівалась з сялянствам і гарадскім насельніцтвам. Зразумела, што гэта мела больш бытавы характар, так як шляхта адносілась да сялянства і гарадскому насельніцтву, згодна з царскім заканадаўствам. Былую шляхту лёгка адрозніць ад сялянства. Перш за ўсё, яна моцна трапіла пад уплыў паланізацыі. Задняпроўская і падвінская шляхта размаўляла па-беларуску, але з моцнай прымешкай польскай мовы. Большая частка шляхты – каталікі, меншасць – праваслаўныя. Польскі ўплыў адбіўся на адзенні і звычках шляхціца. Шляхціц збрывае бараду, апранаецца ў чорны або шэры суконны кафтан, на галаве носіць картуз у польскім стыле. Шляхцянка носіць кофту і спадніцу з паркалю, апранаецца ў паліто старадаўняга стылю. Хата шляхціца падобна на беларускую, адрозніваецца яна ад апошняй больш вялікім памерам і чыстай гарэнкай. У гарэнцы знойдзецца "галандская" печка, сцены абклеяны шпалерамі або адштукатураны і выбеляны, на сценах вісяць карціны і люстэрка. Шляхціц карыстаецца прадметамі гарадской абстаноўкі: самавар, газавая лямпа, фаянсавы посуд і іншыя прадметы ўжытку, пакляр, фабрычнае сукно і г. д. Увогуле шляхціц жыве больш багата, чым сялянін. І гэта зразумела, так як шляхціц-земляўласнік мае больш зямлі, чым сялянін. Продкі цяперашняй шляхты ў польска-літоўскі перыяд атрымлівалі за сваю службу значную для сялянскай гаспадаркі надзелы зямлі: надзел вызначаўся ў дзве "валокі", інакш кажучы, у сорак дзясяцін, а бывала атрымлівалі і ад трох да дзясяці валок. Шляхта не ведала цяжкой прыгоннай залежнасці. Таму гаспадарка шляхціца мела дастатковую колькасць зямлі. Праўда, ёсць і малазямельная шляхта, але яна бярэ зямлю ў арэнду ў суседніх памешчыкаў. Горшае становішча ў той шляхты, якая выйшла з чыншавікоў, сядзеўшы на панскіх землях, многія з іх, не меўшы сваёй зямлі, займаюцца арэндай. Трэба адзначыць, што шляхціц меньш схільны да руціны, чым яго сусед-сялянін. Таму ў спосабах вядзення гаспадаркі заўсёды ёсць некаторыя паляпшэнні. Поле апрацоўваецца лепш, больш рацыянальна, жывёла – лепшай пароды і добра ўскормлены, на агародзе гародніна для патрэб суседняга мястэчка і горада. Нарэшце, шляхціц лепш дасведчаны аб патрэбнасцях і стане суседняга рынку і ўмее гэтым карыстацца [4, с. 201-202].

Будучы ў агульным больш культурным, чым сусед-сялянін, шляхціц не толькі добра разумее значэнне адукаванасці, але праяўляе страмленне да таго, каб даць больш салідную адукацыю сваім дзецям: шляхецкая моладзь абоіх палоў у значнай колькасці праходзіць у гімназіі і універсітэты. Аднак шэрая маса былога шляхецтва, якое выйшла з сялянства, захоўвае яшчэ многія рысы апошняга. Сялянскія звычаі і абрад, роўна як і песня, пануюць ў шляхецкім асяроддзі. На гэтым адбіваецца моцны польскі ўплыў. Людзі, якія блізка кантактуюць з шляхціцам-землеўласнікам, аддавая яму перавагу перад сялянінам, адзначаюць аднак і не зусім сімпатычныя рысы ў характары шляхціца. Блізкасць да польскіх панскіх двароў ўнесла ў асяроддзе шляхціца-земляўласніка некаторыя адметнасці. Шляхціц аддзяляе себя ад сялянства, дужа ганарыцца сваім дваранскім паходжаннем і пагардліва адносіцца да сяляніна, але затое старанна сцелецца перад вышэйшымі [4, с. 202].

Цяжка вызначыць колькасць былой шляхты, так як яна прыпісана да іншых сасловій. Шляхта жыве або асобнымі сем'ямі ў вёсках, або хутарамі, або цэлымі паселішчамі.

Спосаб землекарыстання ў шляхты – участковы. Часам толькі луга і леса застаюцца ў непадзельным карыстанні ўсяго паселішча, калі становіцца незручным разбіць іх на сямейныя ўчасткі. Такі лес хутка спусташаецца і становіцца маленькім зараснікам, але ў асобных участках і часам пры саміх сядзібах захоўваюцца бярозавыя або сасновыя, або дубовыя гаі, залежыць ад мясцовасці [3, с. 602].

Асабліваю каштоўнасць у шляхецкай гаспадарцы складае жывёла. Колькасць жывёлы залежыць і ад колькасці зямлі, якой валодае гаспадар, і ад колькасці корму, якое ён можа нарыхтаваць. У некаторых шляхціцаў бывае па 15-20 коней, 30 кароў, 10-15 свінні, 20-25 авечак, але ў тых, хто жыве на невялікім участке арэнднай зямлі – 2 коні, 2 каровы, 2-3 свінні, 2-3 авечкі. Жывёла мясцовай, дробнай пароды змяшчаецца лепш, чым у сяляніна. Прылады працы ў шляхты тыя ж самыя, што і сялянскія, але, з большага, уласнай вытворчасці.

Галоўны і нават выключны занятак шляхты складае земляробства, іншых промыслаў у іх няма. Земляробства вядзецца звычайным старым парадкам, як і ў сялян, з падзелам на тры змены. Але так як многія гаспадары валодаюць значнай колькасцю зямлі і трымаюць, адносна, шмат жывёлы, то поля іх добра ўгнойваюцца і даюць лепшы ураджай, чым сялянскія ураджаі. [3, с. 605].

Традыцыйная культура палякаў мела свае асаблівасці. У жыллёвым будаўніцтве найбольш распаўсюджаным варыянтам было трохкамернае жыллё(хата-сенцы-хата), якое ў народзе называлі домам на дзве стараны(хата на два канцы). Найбольш распаўсюджаным тыпам забудовы быў пагонны двор, калі жылы дом з гаспадарчымі пабудовамі ставіліся ў адзін доўгі шэраг, часта пад адным дахам. Асноўнымі элементамі інтэр'еру былі печ, покуць (цэнтральнае месца ў доме, своеасаблівы хатні алтар), бабін кут (гаспадарчы кут), стол, лаўкі, палаткі (месца, дзе спалі жыхары дома). На сцяне алтара вісела мноства ікон з выявамі каталіцкіх святых. Польска-дваранскі ўплыў адбіўся на вопратцы шляхты (каларыт, крой, характар арнаменту, манера нашэння). М. В. Доўнар-Запольскі адзначаў, што “польскі ўплыў адбіўся на вопратцы і звычках шляхты. Шляхціц зголье бараду, апранае чорны або шэры тканкавы кафтан, а на галаве носіць картуш ў польскім стылі. Шляхцянка носіць кофту і спадніцу з паркалю, апранаецца ў паліто старадаўняга крою” [4, с. 201].

У палякаў у Беларусі склаліся ўстойлівыя погляды на сям'ю і сямейныя традыцыі. Важным аспектам шлюбу для іх была прыналежнасць да той ці іншай рэлігіі, напрыклад паміж палякамі-каталікамі і палякамі-пратэстантамі. Супраць такога шлюбу часцей выступалі бацькі і сваякі старэйшага пакалення.

Хрышчэнне дзіцяці было важным момантам у сямейных абрадах палякаў. Хрысцілі звычайна ў першыя дні або тыдні пасля нараджэння. Гэта не толькі акт прыняцця нованароджанага ў лонна Касцёла, але і далучэнне яго да свайго роду, сям'і. Пасля хрышчэння дзіцяці ў царкве ўладкоўвалася трапеза, у якой бабка-павітуха і хросныя займалі самае ганаровае месца. Па звычаі пры хрышчэнні маглі прысутнічаць толькі жанатыя мужчыны і замужнія жанчыны. Хросныя бацькі нованароджанага пяклі ў якасці пачастункі вялікія булкі – лялячкі [1, л. 45]. Згодна распаўсюджанаму меркаванню, яны станавіліся блізкімі для дзіцяці людзьмі, як бы радніліся паміж сабой, і па неафіцыйнай распаўсюджанай думцы хросныя бацькі не маглі ўступаць у шлюб адзін з адным, хоць па каталіцкіх законах такой забароны не было.

Імя нованароджанага ў палякаў, асабліва хлопчыкаў, часцей за ўсё перадавалася з пакалення ў пакаленне, таму амаль у кожнай сям'і былі свае радавыя імёны. Касцёл адыгрываў важную ролю ў выбары імя дзіця. Згодна з рэлігійным традыцыям, падчас хросту новаму хрысціяніну давалі імя, выбіраючы яго з календара – з імёнаў святых, якія выпалі на адпаведныя або блізкія дні. Абрад першай стрыжкі дзіцяці праходзіў, калі ён пачынаў гаварыць. Звычайна стрыгуць па дасягненню дзіцем аднаго года, валасы спальваюць у печы або пускаюць па бягучай вадзе [1, л. 34].

Пахавальныя і памінальныя абрады беларускіх палякаў таксама мелі свае асаблівасці. Па традыцыі чалавек павінен быў сустрэць смерць у роднай хаце сярод сваякоў. Перад смерцю ён збіраў усіх членаў сям'і, прасіў прабачэння перад усімі за правіны і аддаваў апошнія навучанні. Ён прасіў паклікаць святара для апошняй споведзі, і калі царква была блізка, гэта жаданне выконвалася, калі не, то старэйшы член сям'і павінен быў яго перахрысціць. Гэта азначала прабачэнне грахоў і тое, што дамачадцы даруюць паміраючаму ўсе дрэнныя ўчынкі і крыўды. Смерць за межамі роднага дома лічылася сумнай. Самагубства асуджалася яшчэ і таму, што, згодна з рэлігійным вераваннем, такая смерць адпраўляла самазабойцу на вечныя мукі ў пекле і была ганьбой для ўсёй сям'і [1, л. 81].

Памінкі па памерламу звычайна ўладкоўваліся праз трыццаць дзён і праз год. У царкве заказвалі службу, маліліся, хадзілі на могілкі, праводзілі жалобную трапезу. Памінкі ажыццяўляліся польскім насельніцтвам і ў так званы Дзень Ушэсця Гасподняга, або Дзень усіх святых, які адзначаецца 2 лістапада. Уся сям'я ішла на могілкі, дзе напярэдадні прыбіралі, запальвалі свечкі, маліліся, жанчыны гучна галасілі каля свежых магіл.

Сярод святаў і абрадаў народнага календара большасць палякаў адзначалі Каляды і Вялікдзень. Да Свята нараджэння Хрыстова ў сям'і рыхтаваліся загадзя: білі кабана, гатавалі розныя мясныя стравы,

гаспадыня прыбірала ў доме. Напярэдадні Калядаў, 24 снежня, святкавалі нішчымную куццю. Пасля заходу сонца і з'яўлення зорак на небе ўсе члены сям'і садзіліся за стол, на які клалі сена і накрывалі яго зверху белым абрусам. Гаспадыня ставіла на стол посныя стравы: кашу з круп, аўсяны кісель, селядзец, смажаную рыбу, грыбныя стравы, вушкі з макам, яблыкамі і грыбамі, галушкі і інш. [5, с. 380].

Сямейная вячэра пачынаўся з малітвы. Усе станавіліся на калені і маліліся. Затым гаспадар (ці гаспадыня) дома бралі аплатку, загадзя набытую ў касцёле, падыходзілі да кожнага з прысутных, прапаноўвалі адламаць частку і з'есці яе кожнаму члену сям'і, выказваючы кожнаму з іх пажаданні здароўя, поспехаў. Затым яны садзіліся за стол. У прамежках з-пад абрусы выцягвалі сцеблы сена і па іх даўжыні прадказвалі будучы ўраджай лёну. Пасля абеду ўсе спявалі калядныя песні і пачыналі ўпрыгожваць ёлку цацкамі [2, с. 63].

Такім чынам, рэлігія аказала моцны ўплыў на паўсядзённае жыццё палякаў. З ранніх гадоў іх вучылі маліцца, вадзілі ў касцёл і выхоўвалі ў лепшых каталіцкіх традыцыях, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Але варта заўважыць, што лепшыя сельскія гаспадары, арандатары і эканомы належаць да польскай народнасці, а таксама складаюць самую адукаваную, багатую і ўплывовую частку насельніцтва. Хаця палякі і ўспрынялі многія элементы традыцыйнай беларускай культуры і, у сваю чаргу, аказалі моцны ўплыў на беларускую народную культуру. У той жа час, нягледзячы на даўнія сувязі, ўзаемаўплыў і міжнацыянальныя адносіны, палякі ўсё ж захавалі многія адметныя рысы сваёй нацыянальнасці.

ЛІТАРАТУРА

1. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ф. 6. Воп. 13. Спр. 67.
2. Обзор Могилевской губернии за 1909 год / Могилев. губ. стат. комитет. – Могилев на Днепре – 1910. – 106 с.
3. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях / под ред. А.С. Дембовецкого. ¬– Могилев, 1882-1884. – 782 с.
4. Россия: Полное географическое описание нашего отечества: настольная и дорожная книга для русских людей: в 19 т. / под ред. В. П. Семенова; и под общ. рук. П.П. Семенова, В.И. Ламанского. – СПб.: А.Ф. Девриена, 1899–1914. – Т. 9: Верхнее Поднепровье и Белоруссия. – 1905. – VII. – 619 с.
5. Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя / Беларус. Сав. энцыкл.; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 575 с.